Н43

БИБЛИОТЕКА
БГУ

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

23 верасня 2008 года, № 14 (1986)

ПАДЗЕЯ

## БУДАЎНІЧЫ БУМ у БДУ!

***12 верасня а 12 гадзіне ля будынка па вуліцы Шпалернай, 7 было надзвычай мнагалюдна. Выклікала гэты ажыятаж прыкметная падзея — адкрыццё новага вучэбнага корпуса Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ.***




*Калектыў выкладчыкаў і студэнтаў ДзІКСТа разам з кіраўніцтвам святкуюць наваселле.*

Гэты дзень стаў сапраўдным святам для паўтары тысячы студэнтаў (з іх 640 – дзённай формы навучання) спецыяльнасцяў "Менеджмент", "Маркетынг", "Правазнаўства" і іх выкладчыкаў, а новы корпус – цудоўным падарункам пасля двухгадовага чакання. Менавіта столькі працягвалася рэканструкцыя гэтага імпазантнага будынка, размешчанага ў гістарычнай частцы горада (тут знаходзяцца вуліцы Ракаўская, Кальварыйская, Мельнікайтэ). Цяпер у чатырохпавярховым корпусе размясціліся сучасныя вучэбныя аўдыторыі, бібліятэка, кампутарная зала, спортзала і кавярня.

Дырэктар ДзІКСТа, заслужаны работнік адукацыі нашай краіны, доктар гістарычных навук прафесар Пётр Брыгадзін з задавальненнем паказаў сваю новую гаспадарку гасцям і калегам, сярод якіх былі рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў, прарэктары і дэканы факультэтаў. Кожны кабінет, дзе праводзілася экскурсія, выклікаў шмат ухвальных слоў. І сапраўды, папрацавалі будаўнікі на славу! Дапамагалі ім пры гэтым і студэнты, якія масава завіхаліся на суботніках, старанна наближаючы час адкрыцця новых сцен сваёй альма-матэр.

Дарэчы, за гісторыю існавання Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій тут сфарміравалася універсітэцкая вучэбная школа ў галіне менеджменту, дызайну, сацыяльнай работы. На 6-ці кафедрах працуюць 128 выкладчыкаў, сярод якіх 10 дактароў і 59 кандыдатаў навук. Калектыў студэнтаў, магістрантаў і слухачоў налічвае каля 3 тыс. чалавек.

Варта адзначыць, што за апошнія пяць гадоў у рэспубліцы пабудаваны тры вучэбныя карпусы для вышэйшых навучальных устаноў і два з іх – для нашага універсітэта.

З наваселлем, калегі!

**Кацярына РАМАНАВА**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

***Міністр замежных спраў Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі Нкасазана Дламіні-Зума ў рамках свайго рабочага візіту ў нашую краіну 11 верасня выступіла з лекцыяй перад выкладчыкамі і студэнтамі Белдзяржуніверсітэта.***

## СТАСУНКІ З ПАЎДНЁВА-АФРЫКАНСКАЙ РЭСПУБЛІКАЙ

Лекцыя "Сацыяльна-эканамічнае развіццё ПАР" чыталася на англійскай мове. Затым госця адказала на пытанні аўдыторыі, якія тычыліся агульнапалітычных тэм, біяграфічных аспектаў, а таксама супрацоўніцтва ў галіне навукі і адукацыі. У заключэнне спадарыня Дламіні-Зума адзначыла, што, пачынаючы з 2007 года, таваразварот паміж дзвюма краінамі павялічыўся ў некалькі разоў (імпарт беларускіх тавараў, а гэта ў асноўным азот-калій і шыны, узрос з 5 млн да 20,8 млн долараў, а паўднёваафрыканскі экспарт – да 4,8 млн долараў), і маюцца добрыя магчымасці для пашырэння гандлёвых і эканамічных сувязяў.



*Нкасазана Дламіні-Зума.*

Нкасазана Дламіні-Зума з'яўляецца ганаровым прафесарам БДУ. Гэтым званнем яна была ўшанавана на ўрачыстым пасяджэнні Вучонага савета 6 ліпеня 2007 г.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

КАНТАКТЫ

## КАСМІЧНАЯ КААПЕРАЦЫЯ

***Наш універсітэт 5 верасня наведаў дырэктар сеткі міжнародных цэнтраў рэлятывісцкай астрафізікі (ICRANet) Рэмо Руфіні. На сустрэчы з рэктарам БДУ Васілём Стражавым была падпісана дамова аб двухбаковым навуковым супрацоўніцтве.***

Пагадненне прадугледжвае сумесныя даследаванні ў галіне астрафізікі, астраноміі і тэарэтычнай фізікі, правядзенне семінараў і канферэнцый, абмен аспірантамі і навукоўцамі, матэрыяламі і навуковымі публікацыямі. У красавіку 2009 г., абвешчанага ААН Міжнародным годам астраноміі, на базе БДУ плануюцца дні астраноміі, удзельнічаць у якіх будуць выбітныя вучоныя ў галіне касмічных даследаванняў.

Дарэчы, рэлятывісцкая астрафізіка ў межах агульнай тэорыі адноснасці вывучае касмічныя аб'екты з экстрэмальнымі ўласцівасцямі (нейтронные зоркі, квазары, пульсары, чорныя дзіркі), іх узаемадзеянне і ўплыў на чалавецтва. Гэты напрамак імкліва развіваецца ў апошнія дзесяцігоддзі дзякуючы вываду ў космас спадарожнікаў са спецыяльнай навуковай апаратурай. Гэта абумоўлівае міжнародны характар даследаванняў, паколькі ажыццяўленне навуковых праграм такога кшталту не пад сілу асобна ўзятым дзяржавам.



*Дырэктар ICRANet Рэмо Руфіні.*

**Рэмо РУФІНІ** – З 1978 года прафесар тэарэтычнай фізікі Рымскага універсітэта "Сапіенца", прэзідэнт Міжнароднага цэнтра рэлятывісцкай астрафізікі (ICRA), заснавальнік міжнароднай дактарантуры (IRAP) у дадзенай галіне на базе шэрагу еўрапейскіх універсітэтаў і даследчых інстытутаў. Акрамя таго, з'яўляецца стваральнікам міжнароднай сеткі даследчых інстытутаў ICRANet у некалькіх краінах. Аўтар больш як 300 публікацый і 21 манаграфій па астрафізіцы.

**Сяргей КУРЫЛА**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

### СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**СЛЭНГ, ПІВА, ДЖЫНСЫ: МАВЕТОН ЦІ ДЭМАКРАТЫЯ?**
Абмяркоўваем культуру паводзін у моладзевым асяроддзі. **Стар. 2**

**CHINA НА КІРЫЛІЦЫ**
Інстытут імя Канфуцыя БДУ падрыхтаваў унікальнае выданне. **Стар. 3**

**НОВЫ МАРШРУТ АТРЫМАЎ ЖЫЦЦЁ**
Студэнтаў з філіяла БДУ ў Шчомысліцах падвозіць новы аўтобус. **Стар. 4**

НА СПЕЦЫЯЛЬНЫМ УКЛАДЫШЫ дадзенага нумара газеты РАЗМЕШЧАНЫ ЗМЕСТ І ЎМОВЫ **ВІКТАРЫНЫ па УНІВЕРСІТЭТАЗНАЎСТВЕ,** прымеркаванай да чарговай гадавіны БДУ

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

УКАЗАМ прэзідэнта краіны рэктару БДУ прафесару Васілю Стражаву нададзена ганаровае званне "Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь".

ЗАГАДАМ рэктара БДУ Васіля Стражава факультэт журналістыкіператвораны ў Інстытут журналістыкі ў складзе факультэтаў журналістыкі і павышэння кваліфікацыі журналісцкіх кадраў.

ПРАФЕСАР Ірына Казакова прызначана першым прарэктарам Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы БДУ, а прафесар Віктар Шадурскі ўзначаліў факультэт міжнародных адносін.

ПРАРЭКТАР па навуцы Уладзімір Панькоў 12 верасня сустрэўся з кубінскай дэлегацыяй на чале з дарадцам па навуцы Старшынёй Дзяржаўнага Савета і Савета Міністраў Кубы прафесарам Фідэлем Кастра Дзіасам-Балартам. Былі абмеркаваны перспектывы двухбаковага супрацоўніцтва.

ВЫКЛАДЧЫКІ і супрацоўнікі БДУ ў верасні атрымаюць матэрыяльную дапамогу ў памеры 150 тыс. руб.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

### ПАСЯДЖЭННЕ ВУЧОНАГА САВЕТА БДУ

Пашыранае пасяджэнне Вучонага савета на тэму "Вынікі работы Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў 2007–2008 навучальным годзе і задачы на 2008–2009 навучальны год" адбудзецца 29 верасня ў 10.15 у актавай зале вучэбнага корпуса БДУ на Кальварыйскай, 9. Дакладчык – рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў.

VOX POPULI

# СЛЭНГ, ПІВА, ДЖЫНСЫ: МАВЕТОН ЦІ ДЭМАКРАТЫЯ?

***Культура паводзін у моладзевым асяроддзі — шырокае паняцце, якое не звядзеш да апраткі маладых людзей, іх гутаркі ды прынцыпу "паважай старэйшых". Каб разабрацца, што ўваходзіць у гэтую культуру, у якой ступені ёю валодаюць студэнты БДУ і што рабіць, калі камусьці культуры не стае, мы звярнуліся да прадстаўнікоў розных структур нашага універсітэта.***

## СТУДЭНТЫ ЗДОЛЬНЫЯ ДА САМААНАЛІЗУ

***Вольга Жук – загадчык кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі БДУ:***

– Выхаваць культуру паводзін – задача сям'і і школы. Амаль 50 % школьных прадметаў носяць гуманітарны характар, яны нацэльваюць моладзь на пазнанне сябе, вучаць выбудоўваць стасункі з самім сабой і светам. У вышэйшай навучальнай установе варта казаць аб развіцці ў асобы культуры сацыяльнага ўзаемадзеяння, культуры разумовай працы, культуры прафесійных зносін.

Працую ва універсітэце з 1981 года, выкладаю на II–IV курсах, 6 гадоў вяла клуб "Студэнцкая сям'я XXI стагоддзя". Маю вялікі вопыт стасункаў са студэнтамі – і дасюль не сутыкалася з праблемай, што моладзь не ўмее сябе паводзіць.

Адукацыйнае асяроддзе – галоўны фактар фарміравання культуры. Не якіясьці рэзкія рэплікі выкладчыка, не заўвагі тут важныя. Кожны член студэнцкага калектыву здольны адрэфлексаваць, адсачыць свае паводзіны, параўнаць іх з тым, як паводзяць сябе калегі па акадэмічнай групе. Затым, існуе карпаратыўная культура, якая рэгулюе нормы ўзаемадзеяння ў пэўным згуртаванні прафесіяналаў. Так, асноўныя нормы паводзін у БДУ замацаваны ў яго Статуце, з якім студэнты знаёмяцца на першым курсе. У гэты ж час даюцца некаторыя ўстаноўкі на агульных сходах першакурснікаў – гэтага бывае дастаткова. Вось прыклад са штодзённай практыкі: у галоўным корпусе студэнт сядзеў на падваконні, яго прамінуў дэкан. Ён толькі зірнуў – і юнак адразу ж саскочыў, інцыдэнт быў вычарпаны. Калі студэнты знаходзяцца ва аўдыторыях у верхняй вопратцы – хапае адной заўвагі...

Дадаткова далучэнне студэнтаў да пэўных нормаў здзяйсняецца падчас засваення дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыклу. Правіламі паводзін дапамагаюць авалодваць такія дысцыпліны, як этыка, псіхалогія, педагогіка, якія прапагандуюць агульначалавечыя каштоўнасці. Вельмі важная і пазааўдыторная праца, што ўключае самыя розныя кірункі: рэгуляванне жыцця ў інтэрнатах, гісторыка-краязнаўчую ды іншую дзейнасць, кураторскія гадзіны. Выкладчык сам павінен быць узорам культурных паводзін.

## ЛЫЖКА ДЗЁГЦЮ

***Тамара Суворава – начальнік аддзела моладзевых праграм і праектаў УВРМ:***

– Калі падчас мерапрыемстваў студэнты не проста "хварэюць" за сваю каманду, што на сцэне, а пачынаюць звяртацца да непрыгожых метадаў, не даюць выступіць камандам-канкурэнтам – гэта ўжо перасячэнне мяжы паміж ухвальнай падтрымкай сваіх калегаў і хуліганствам. Студэнты, якія ўдзельнічаюць у нашых мерапрыемствах, – найчасцей валанцёры, мы імі ганарымся і зазвычай прыводзім у прыклад іншым. І міжволі прыпісваем ім пэўныя лідарскія якасці, высакароднасць – яны гэтаму ў асноўным адпавядаюць, але часам заўважаеш вузкакарпаратыўныя прыхільнасці. Сапраўдны лідар мусіць дбаць пра развіццё моладзевага студэнцкага руху цалкам, увогуле, а не прасоўваць толькі сваю арганізацыю, каманду, групу. Павага, сяброўства, імкненне падтрымаць слабейшага не павінны замыкацца на нейкім вузкім коле "сваіх".

Аматарам вольна сябе паводзіць трэба памятаць, што адзін выбрык падчас мерапрыемства можа сапсаваць уражанне ад усяго факультэта. Асабліва гэта датычыць імпрэзаў, куды мы запрашаем гасцей не з нашага універсітэта – яны не ведаюць, якія ў нас цудоўныя студэнты, і мяркуюць аб іх па ўбачаным. *Дрэнныя паводзіны* аднаго студэнта могуць перакрэсліць дасягненні многіх яго калег. Калі ж такіх выпадкаў надараецца два, непрыемнае ўражанне замацоўваецца. Непакоіць, што з кожнага універсітэцкага мерапрыемства даводзіцца па некалькі студэнтаў выводзіць на "нецвярозых" нагах.



Ва аўдыторыі, як дома?

У студэнтаў часам кульгае *культура маўлення*: пад уплывам эмоцый у кожнага могуць вырвацца та-кі-я фразы... Як чалавек гаворыць, люструе, як ён успрымае навакольны свет. Калі ў гутарцы студэнт выказвае непавагу да чаго заўгодна, значыць, ён не паважае ўвесь свет і найперш сябе. Павышэнне культуры маўлення вельмі істотна для развіцця асобы, самаўдасканалення. Студэнцкія арганізацыі гэта добра разумеюць: Студэнцкі саюз, напрыклад, выпрацаваў штрафы за пэўныя эмацыйныя словы, лічачы, што культура размовы ў арганізацыі адбіваецца на тым, як гэтая арганізацыя пазіцыянуе сябе. Здаецца, той, у каго "выслізгнула" мацернае слоўца, мусіць заплаціць 5 тысяч.

*Цыгарэтнага дыму* ў БДУ стала меней – калі я вучылася на гістфаку, першы паверх проста ахутвала тытунёвая смуга, палілі нават побач з аўдыторыямі. Нядаўна была сведкаю цікавай сітуацыі, калі студэнт зрабіў заўвагу свайму калегу наконт курэння ў неналежным месцы – і курэц мітусліва затушыў цыгарэту.

Да *культуры знешняга выгляду* мы ставімся дэмакратычна, і гэта радуе. Аднойчы мы сустракалі ў САК "Брыганціна" гасцей з Мазыра, дык начальнік упраўлення работы з моладдзю была здзіўленая тым, што нашы студэнты выходзілі на сцэну ў ботах, а на секцыі з'яўляліся ў спартыўных касцюмах. Яна хапалася за галаву – маўляў, каб гэта яе студэнты дэманстравалі такую культуру знешняга выгляду, яе на наступны дзень папрасілі б пакінуць пасаду. Мы ж упэўнены, што студэнты самі здольны адчуць, якія строі адпавядаюць якой атмасферы, ацаніць, як апранаюцца іншыя члены калектыву – ніякімі штрафамі так не паўплываеш. Важна не парушыць мяжу: каб чалавек сваім знешнім выглядам не выказваў непавагу да іншых.



Сюды б яшчэ падушку з коўдрай...

У цэлым, студэнты БДУ выгадна вылучаюцца ўзроўнем культуры сярод іншай моладзі, адказна ставяцца да сваіх паводзін. Лішнія забароны толькі перашкодзяць раскрыццю іх асобы.



Ці не замінае экстравагантная вопратка вучобе?

## ПАРУШАЛЬНІКАМ ТУТ НЕ МЕСЦА

***Наста Кацэвіч – старшыня Савета па прафілактыцы парушэнняў Правілаў унутранага распарадку ў студэнцкіх інтэрнатах:***

– У жыцці мы пастаянна парушаем нейкія правілы. Напрыклад, пераходзім дарогу на чырвонае святло. Наказваць студэнтаў за ўсе дробныя парушэнні і праз гэта блага адзывацца пра ўсё студэнцтва – няправільна. Але бываюць і вельмі непрыгожыя выпадкі – бойкі, хамства, непаважлівыя адносіны да супрацоўнікаў БДУ, чальцоў аператрадаў, што дбаюць пра парадак у інтэрнатах, і да т. п. Яны адзінкавыя і не складаюць сістэмы. Мы прымаем прафілактычныя захады, каб звесці колькасць такіх непрыемных здарэнняў да мінімуму. Радуе, што за апошнія два гады агульная колькасць парушэнняў зменшылася амаль утрая, прычым істотна паменшылася доля "асабліва грубых" парушэнняў. Да іх ліку адносіцца, найперш, курэнне ў памяшканні інтэрната – распаўсюджаная загана (у чым сваю ролю адыгрываюць студэнты-замежнікі – яны патрабуюць асаблівай увагі з боку нашага Савета). Затым ідзе распіванне алкагольных напояў у межах інтэрната, бойкі, невыкананне правілаў прапускнога рэжыму, калі "госці" пачынаюць лазіць праз вокны ці балконы, што можа прывесці да траўмаў. "Грубыя" парушэнні – гэта непавага да прапускнога рэжыму (прыкладам, перадача пропуска пабочным асобам), пажарнай бяспекі (выкарыстанне электрапрыладаў), санітарных нормаў. З апошнім досыць складана: у кожнага ёсць свая планка, сваё ўражанне аб *культуры пражывання*. За такія правінасці першым разам студэнту робіцца вымова, калі ж сітуацыя не выпраўляецца, можа ісці гаворка пра пазбаўленне месца ў інтэрнаце. Найвышэйшая мера пакарання – хадайніцтва перад рэктарам аб адлічэнні, але да гэтага мы прыбягаем у крайніх выпадках, напрыклад, калі чалавека пазбаўляюць месца ў інтэрнаце, а ён у гэты час робіць яшчэ нейкае сур'ёзнае парушэнне.

За "найменш грубыя" парушэнні, калі іх здзяйсняюць упершыню, не наказваем: позні прыход без уважнай прычыны, парушэнне цішыні пасля 23 гадзін (у час сесіі – наказваем), зрыў дзяжурства па кухні (у інтэрнатах, дзе няма смеццеправоду, праблема стаіць больш востра, таму там за такое – наказваем).

Кожнае спагнанне адбіваецца на засяленні наступнага года. Напрыклад, атрымаўшы вымову, студэнт становіцца апошнім у чарзе на засяленне. Спагнанне можа быць знятым праз паўгода. Існуюць і крытэрыі для датэрміновага вызвалення ад пакарання (падобныя да тых, што адбіваюцца на памяншэнні аплаты за навучанне, – удзел у навуковай дзейнасці, адзнакі не ніжэй за "сем" і да т. п.).

Стараемся, каб перад спагнаннямі ўсе былі роўныя, каб за тое, за што дакараюць ў адным інтэрнаце, не выганялі ў іншым. Клопату дадаюць студэнты, якія карыстаюцца сацыяльнымі льготамі і праз гэта не могуць быць выселеныя з інтэрната. Прыкладам, "чарнобыльцы" ці сіроты часам проста нахабнічаюць, адчуваючы сваю беспакаранасць. "Актыў" таксама, на жаль, часцяком парушае правілы – мы намагаемся патураць тым, хто добра сябе зарэкамендаваў (маем інфармацыю, за што студэнту належаць якія прывілеі – добра вучыцца, уваходзіць у склад універсітэцкіх зборных і г. д.), але часта яны не пакідаюць магчымасці абысціся з імі "мякчэй".

Да гонару нашых студэнтаў, асноўная маса парушэнняў – выпадковыя. Падчас разгляду інцыдэнту на студсавеце бачна, што "парушальнік" раскайваецца і мае намер больш не здзяйсняць падобнага, – гэта радуе. Ёсць, праўда, і тыя, хто не зважае на нашы заўвагі – думаю, тут істотны характар чалавека, яго выхаванне, кампанія, у якую патрапіў.

Нам часам кажуць, што дзейнічаем надта жорстка – прыкладам, што не варта пазбаўляць жылля за курэнне ў інтэрнаце, калі няма спецыяльна абсталяваных для гэтага месцаў. А як зрабіць такія месцы, калі гэта можа паспрыяць павелічэнню колькасці курыльшчыкаў? У чэргах на засяленне зараз значыцца каля трох з паловаю тысяч студэнтаў. Дык навошта мы будзем дазваляць буяніць у інтэрнатах – хай лепей засяляюцца тыя, хто ўмее сябе паводзіць".

**Падрыхтавала Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

Маветон – (ад фр. *mauvais ton* – благі тон) – паводзіны, манеры і ўчынкі, не прынятыя ў прыстойным грамадстве; нявыхаванасць.

• • • • • • • • • • • • • •

## ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

*Рэдакцыя газеты задумала цыкл публікацый на тэму "Культура паводзін у моладзевым асяроддзі", якая вартая сур'ёзнай дыскусіі. Шчыра запрашаем далучыцца да абмеркавання сітуацыі ва універсітэце. Зробім альма-матэр не толькі адукацыйным, але і культурным маяком у сістэме вышэйшай школы!*

## ШТО ДУМАЕМ?

***Сяргей Г.***: "Вучоба без піва — марнаванне часу! Благі той журналіст, які не п'е, як конь..."

***Коля Б.***: "Мужчына павінен быць моцным, а значыць, здольным сказаць "не" курэнню, алкаголю і брыдкаслоўю".

***Ганна П.***: "Нават і глядзець на хлопца не буду, калі ён без мата двух слоў звязаць не можа".

***Юля П.***: "Каб прывабіць дзяўчыну, мужчыны павінны сачыць за сабой, за сваім целам. Ну што яны ўсе такія здыхлікі? Вось ім залаў трэнажорных панабудавалі, а яны ўсё піва цыгарэтай закусваюць! Фі! Скура і валасы прадыміліся, побач стаяць непрыемна".

***Таня Ч.***: "Мне падабаецца, калі ад хлопца тытунём пахне. Нейк па-даросламу. І рамантычна, як у кіно, — герой зацягваецца, пасля адкідае цыгарэту і цалуе выратаваную дзяўчыну".

***Вера Б.***: "Крыху алкаголю дапамагае расслабіцца, зняць напругу пасля цяжкага дня, забыцца... Гэта не значыць, што трэба напівацца так, каб назаўтра на пары не ўстаць".

***Андрэй К.***: "Што хачу, тое і раблю! Хачу — гарэлку п'ю, хачу — вучуся. Столькі разоў нам казалі на першых курсах, што мы самастойныя людзі. Самастойныя? Ну дык ідзіце ... са сваімі парадамі! На што ён мне здаўся гэты ваш здаровы лад жыцця?".

ВІКТАРЫНА



# ПАПАРАЦЬ-КВЕТКА ЗАЦВІТАЕ ДЛЯ ЦЯБЕ Ў БДУ

*Напярэдадні дня нараджэння БДУ запрашаем вас паўдзельнічаць у віктарыне паводле курса "Універсітэтазнаўства" – "Папараць-кветка зацвітае для цябе ў БДУ".*

*Віктарына ахоплівае пытанні развіцця сусветнай вышэйшай адукацыі, а таксама асветы, навукі, культуры нашай краіны і гісторыі БДУ, што павінна дапамагчы авалодаць досведам мінулых пакаленняў, будзе садзейнічаць пашырэнню кругагляду, фарміраванню светапогляду і духоўнасці.*

*Важна, каб будучыя маладыя прафесіяналы адчувалі сябе патрыётамі, спасцігалі прамудрасці навучання, разумелі, што росквіт краіны ў многім залежыць ад паўнаты рэалізацыі маладых талентаў, што папараць-кветка "зацвітае" для іх падчас вучобы ў БДУ.*

*Жадаю поспехаў і ўдачы!*

*Рэктар БДУ*
*прафесар Васіль Стражаў*



## I УЗРОВЕНЬ

### "Студэнт – гэта той, хто абпальвае бровы...": З гісторыі універсітэтаў Сярэднявечча

**1. Каму давалі клятву вернасці студэнты сярэднявечных універсітэтаў?**
а) сваёй "alma mater";
б) Папе Рымскаму;
в) роднаму гораду;
г) высокай навуцы.

**2. "Калматымі" ў Сярэднявеччы студэнтаў называлі:**
а) у процівагу "белападкладачнікам";
б) за звычай хадзіць "з грывай";
в) на злосць "распамажаным" багацеям;
г) з-за адсутнасці грошай на цырульню.



**3. Абвядзіце кружочкам факультэты ў класічных універсітэтах Сярэднявечча:**
а) права;
б) філасофіі;
в) астралогіі;
г) тэалогіі;
д) медыцыны;
е) свабодных мастацтваў.

**4. Якая расліна названа ў гонар заснавальніка Гарадзенскай каралеўскай медыцынскай акадэміі?**
а) манбрэцыя;
б) шалфей;
в) жыліберцыя;
г) Herba Violae (трава фіялкі).

**5. У які час былі ўтвораны першыя універсітэты свету:**
а) Балонскі універсітэт; б) Парыжскі універсітэт; в) Оксфардскі універсітэт; г) Манпелье?
а) 1158 г.;
б) 1200 г.;
в) 1167 г.;
г) 1137 г.

## II УЗРОВЕНЬ

### Універсітэты свету

**1. Каму належаць наступныя радкі верша, і аб чым яны сведчаць:**
*Каждый согласен: по праву*
*Салерно – бессмертная слава!*
*Целого света стеченье*
*Туда, чтоб найти исцеленье.*
*Я полагаю, что верно*
*Учение школы Салерно.*

а) архіпаэт Сярэднявечча – пра папулярнасць медыцынскай школы ў Салерна;
б) дэвіз вагантаў, якія накіроўваліся на вучобу ў Італію – пра іх імкненне да вучобы;
в) цытата са Статута Балонскага універсітэта са сведчаннем узроўню адукацыі;
г) радкі з заклікам аб наборы ў Балонскі універсітэт з мэтай павялічыць колькасць слухачоў.

**2. Калі была адчынена Гарадзенская медыцынская акадэмія (Ecole Royale de Medecine a Grodno) і ў прысутнасці якога караля?**
а) у 1776 г. з удзелам караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага;
б) 16 красавіка 1803 г. заканадаўчым актам імператара Аляксандра I;
в) у 1364 г. па загадзе караля Казіміра Вялікага;
г) 12 студзеня 1755 г. загадам імператрыцы Елізаветы Пятроўны.

**3. Выніковая праца студэнтаў сярэднявечнага універсітэта насіла назву:**
а) "курсавая"
б) "дыпломная"
г) "магістарская"
д) "сумы".

**4. Як утварыўся універсітэт у Падуі (1222 г.), у якім пазней вучыўся Ф. Скарына?**
а) сыходам студэнтаў з Балонскага універсітэта;
б) паводле загаду імператара;
в) "насаджэннем" свецкай уладай;
г) дзякуючы мабільнасці універсітэта;
д) у выніку канкурэнцыі гарадоў.

**5. У царкве якога універсітэта свету ёсць вітражы, на знешніх вокнах якіх у выглядзе мазаікі прадстаўлены старазапаветныя гісторыі, а на ўнутраных – адпаведныя ім новазапаветныя?**
а) Кембрыдж;
б) Оксфард;
в) Гарвард;
г) Карлаў універсітэт у Празе;
д) Ягелонскі універсітэт у Кракаве;
е) Універсітэт у Тэль-Авіве.

**6. Адкуль прыведзены наступныя вершаваныя радкі?**
*"От зори до зори,*
*Чуть зажгут фонари,*
*Все студенты по улицам шляются.*
*Они песни поют..."?*
а) са студэнцкай песні познага Сярэднявечча;
б) эпіграма паэта Г. Дзяржавіна на ліцэістаў;
в) верш А. Пушкіна, напісаны ў Царскасельскім ліцэі;
г) радкі са студэнцкага фальклора.




**7. У якім універсітэце свету не трэба плаціць за грамадскі транспарт, не дазволена карыстацца аўтамабілямі і практычна з любога месца можна дабрацца на заняткі пешкі ці на веласіпедзе?**
а) Варшава;
б) Прага;
в) Кембрыдж;
г) Гарвард;
д) Сарбона.

**8. Згодна з легендай Оксфард заснаваны за сценамі манастыра, у якім схавалася ад каралеўскага жаніха саксонская прынцэса Фрыдэсвіда. Як перакладаецца слова "Оксфард"?**
а) брод для жывёлы;
б) сцяна кахання;
в) бераг ведаў;
г) мост сяброўства.

**9. Які найстарэйшы універсітэт у Новым свеце стаў alma mater для сямі амерыканскіх прэзідэнтаў?**
а) Гарвардскі;
б) Вашынгтонскі;
в) Чыкагскі;
г) Каліфарнійскі.

**10. З якога часу ва універсітэтах свету існуюць інстытуты рэктара, дэкана?**
а) з часоў пасля 1240 г.;
б) з XX стагоддзя;
в) пасля 1921 г.;
г) пасля 1945 г.

**11. Назавіце дакладную дату ўтварэння Адукацыйнай камісіі на землях Беларусі – прааобраза сучаснага Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.**
а) 1773 г.;
б) 1780 г.;
в) 1760 г.;
г) 1770 г.

## III УЗРОВЕНЬ

### БДУ: экалогія духу. Гісторыя і сучаснасць

**1. Якая дата лічыцца Днём нараджэння Беларускага дзяржаўнага універсітэта?**
а) 7 чэрвеня 1855 г.;
б) 30 кастрычніка 1921 г.;
в) 1 лістапада 1943 г.;
г) 9 мая 1945 г.

**2. Дзе размешчана стылізаваная «папараць-кветка» ў Беларускім дзяржаўным універсітэце?**
а) у дворыку універсітэцкага гарадка;
б) у вестыбюлі будынка рэктарата;
в) на біялагічным факультэце ў Шчомыслíцах;
г) у галоўным корпусе БДУ;
д) на геаграфічным факультэце;
е) на тэрыторыі спартыўна-аздараўленчага комплекса «Брыганціна».

**3. Што сімвалізуе залацістая галінка на васільковым фоне афіцыйнага геральдычнага сімвала – эмблеме БДУ?**
а) папараць-кветку;
б) гусінае пяро пушкінскай эпохі;
в) пальмавую галінку;
г) галінку бярозы;
д) лаўровую галінку.

**4. У складзе якіх факультэтаў пачынаў працаваць Беларускі дзяржаўны універсітэт? (Адказаў можа быць некалькі.)**
а) рабфак;
б) медыцынскі;
в) факультэт грамадскіх навук (ФГН);
г) педагагічны;
д) хімічны;
е) геаграфічны;
ж) фізіка-матэматычны.

**5. Хто з'яўляецца аўтарам верша "Беларускаму універсітэту" да гадавіны заснавання БДУ?**
а) Якуб Колас;
б) Паўлюк Трус;
в) Алесь Гурло;
г) Пятрусь Броўка;
д) Пятро Глебка;
е) Яўгенія Янішчыц;
ж) Алесь Разанаў;
з) Янка Купала.



**6. Якая вуліца ў 1922 годзе была перайменавана ва Універсітэцкую?**
а) Магазінная;
б) Кашарная;
в) Аляксандраўская;
г) Міхайлаўская.

**7. У якім будынку пачаліся універсітэцкія заняткі ў новаствораным БДУ?**
а) гімназіі Фальковіча;
б) духоўнай семінарыі;
в) рэальнага вучылішча;
г) фабрыкі "Вікторыя".

**8. Якія культурныя, навуковыя, адукацыйныя ўстановы створаны з удзелам старэйшага універсітэта (адказ можа быць не адзіным)?**
а) НАН Беларусі;
б) Нацыянальная бібліятэка Беларусі;
в) Саюз пісьменнікаў Беларусі;
г) філармонія.

**9. Хто прачытаў першую лекцыю студэнтам БДУ?**
а) рэктар У. Пічэта;
б) рэктар П. Савіцкі;
в) прафесар-гісторык Дз. Канчалоўскі;
г) вядомы вучоны-этнограф, аўтар трохтомнай працы "Беларусы" Я. Карскі.



**10. На якую тэму была прачытана першая лекцыя ў БДУ?**
а) "Пра культуру Міжземнамор'я ў эпоху панавання Рыма";
б) "Юрыдычнае абгрунтаванне пытання аб дэкрэце адкрыцця універсітэта ў Мінску";
в) "Этнічная культура беларусаў";
г) "Геапалітычнае становішча Беларусі".

ВІКТАРЫНА

# ПАПАРАЦЬ-КВЕТКА ЗАЦВІТАЕ ДЛЯ ЦЯБЕ Ў БДУ

*11. Які юбілей БДУ быў "перапынены вайной"? Якія дакументы сведчылі аб яго падрыхтаванасці? Пазначце адказы.*
а) 10-гадовы, абвестка пра юбілей;
б) 20-гадовы, запрашальны білет, праграма навуковай сесіі;
в) 30-гадовы, зборнік навуковых прац па выніках выступленняў вучоных;
г) 40-гадовы, фатаздымак удзельнікаў.

*12. Калі і дзе аднавіў работу БДУ ў гады Вялікай Айчыннай вайны?*
а) у кастрычніку 1943 г. на станцыі Сходня пад Масквой;
б) у верасні 1945 г. у Мінску;
в) летам 1946 г. у Маскве;
г) у 1944 г. у Магілёве.

*13. Назавіце імёны Герояў Савецкага Саюза, лёс якіх звязаны з Беларускім дзяржаўным універсітэтам:*
а) П.Гарошак;
б) Д.Жмуроўскі;
в) Н.Жолудзеў;
г) Г.Жукаў;
д) М.Зайцаў;
е) М.Катлавец;
ж) А.Кірсанаў;
з) М.Осіпава;
і) У.Парахневіч;
к) А.Патрын;
л) Я.Смушкевіч;
м) А.Філімонаў.



*14. Хто з народных пісьменнікаў Беларусі працаваў у БДУ?*
а) Якуб Колас;
б) Пятрусь Броўка;
в) Янка Купала;
г) Ніл Гілевіч;
д) Іван Навуменка;
ж) Іван Чыгрынаў;
з) Рыгор Барадулін;
е) Іван Мележ.

*15. Якія два вядомыя беларускія вучоныя сталі ля вытокаў утварэння БДУ?*
а) прыват-дацэнт П. Растаргуеў;
б) прафесар М. Доўнар-Запольскі;
в) прафесар Яўхім Карскі, аўтар трохтомнай працы "Беларусы";
г) граф Апалінарый Мікалаевіч Храптовіч-Буценеў;
д) З. Жылуновіч (Цішка Гартны);
ж) прафесар геаграфіі Аркадзь Смоліч;
з) мовазнаўца Браніслаў Тарашкевіч;
е) літаратуразнаўца Максім Гарэцкі.

*16. Як зваўся кот, якога падарыў пры ад'ездзе на радзіму рэктару БДУ У. Пічэту чэшскі вучоны Здэнэк Неедлы?*
а) Баюн;
б) Прошка;
в) Чыча;
г) Ненаяда.

*17. Хто быў першым рэктарам БДУ?*
а) А. Сеўчанка;
б) У. Пічэта;
в) П. Савіцкі;
г) У. Сікорскі.



*18. Які прадмет мужчынскага гардэробу найбольш любіў прафесар У. Пічэта?*
а) элегантныя касцюмы;
б) лакіраваныя чаравікі;
в) гальштукі;
г) капялюш.

*19. Росквіт БДУ у 1950–60-х. гг. звязаны з імем А. Сеўчанкі, які з'яўляецца заснавальнікам навуковай школы...*
а) геадэзіі і картаграфіі;
б) фізічнай оптыкі;
в) археалогіі;
г) прыкладной матэматыкі і інфарматыкі.

*20. Прафесар У. Пічэта займаўся вывучэннем:*
а) гісторыі рымлян;
б) старадаўніх цывілізацый;
в) археалагічных сховішчаў;
г) гісторыі ўсходніх славян.

*21. Што азначае старадаўняя студэнцкая назва універсітэта "alma mater"?*
а) "маці-карміцелька";
б) "строгая маці";
в) "ласкавая маці";
г) "клапатлівая маці";
д) "душа маці";
е) "сэрца маці";
ж) "мацярынскі дом".



*22. Назавіце прозвішча рэктара, які яшчэ да працы ў БДУ падчас Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у закупачнай камісіі па лініі "Lend-Liess" у ЗША ў складзе "Amtorg Trading Corporation":*
а) У. Сікорскі;
б) К. Лукашоў;
в) У. Белы;
г) У. Пічэта;
д) А. Сеўчанка;

*23. Назавіце прозвішча ўраджэнца Беларусі, першага пасла Расійскай дзяржавы ў Японіі, які прыбыў туды на фрэгаце "Палада" ў час кругасветнай вандроўкі:*
а) А. Грамыка;
б) К. Кісялёў;
в) І. Гашкевіч;
г) У. Бонч-Бруевіч.

*24. Якую нацыянальнасць па лініі бацькі ўказаў аднойчы ў анкеце прафесар У. Пічэта?*
а) серб;
б) герцагавінец;
в) паляк;
г) харват;
д) украінец;
е) беларус;
ж) рускі.

## IV УЗРОВЕНЬ
### Універсітэцкі гарадок

*1. Каму з асветнікаў зямлі беларускай узведзены помнікі ў дворыку універсітэцкага гарадка:*
а) С. Будному;
б) Ф. Скарыну;
в) У. Пічэту;
г) А. Сеўчанку;
д) М. Гусоўскаму;
е) А. Міцкевічу;
ж) І. Дамейку;
з) Я. Чачоту;
і) К. Тураўскаму;
к) Я. Коласу;
л) Е. Полацкай;
м) С. Полацкаму;
н) М. Багдановічу;
о) В. Цяпінскаму.

*2. Хто заснаваў першую друкарню на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў Нясвіжы:*
а) Ф. Скарына;
б) С. Полацкі;
в) Е. Полацкая;
г) С. Будны;
д) В. Цяпінскі.

*3. Якая кніга на землях усходніх славян была надрукавана першай?*
а) Біблія;
б) "Псалтыр";
в) "Малая падарожная кніжыца";
г) "Катэхізіс".

*4. У якім годзе на землях усходніх славян з'явілася першая кніга:*
а) 6 жніўня 1517 г.;
б) 1522 г.;
в) 1562 г.;
г) з 1517 па 1519 гг.

*5. Дзе была надрукавана першая кніга, якая з'явілася на землях усходніх славян?*
а) у Вільні;
б) Празе;
в) Нясвіжы;
г) Мінску.

*6. Адкуль узяты наступныя радкі: "Светлай памяці тых, што ад роднага універсітэта пайшлі на свяшчэнную бітву з фашызмам і смерцю герояў палеглі ў змаганні, каб вечна свяціла над нашай радзімаю сонца свабоды"?*
а) словы гераічнай песні ў гонар студэнтаў і выкладчыкаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны;
б) надпіс на Мемарыяльным знаку ў дворыку універсітэцкага гарадка;
в) з верша універсітэцкага паэта;
г) радкі з франтавога ліста студэнта БДУ.

## V УЗРОВЕНЬ
### "Навучанне — гэта тое, што засталося пасля таго, як ты забыўся ўсё, чаму цябе вучылі"

*1. Як называлася універсітэцкае аб'яднанне студэнтаў-беларусаў горада Пецярбурга ў XIX стагоддзі?*
а) "Крывіцкі вазок";
б) "Палачане";
в) "Дрыгавічы";
г) "Радзімічы".

*2. У 1922 г. з удзелам вучоных БДУ ў Мінску адкрыты Інбелкульт (Інстытут беларускай культуры). На яго базе ў 1929 г. утварылася:*
а) Мінітэрства культуры Рэспублікі Беларусь;
б) Дзяржаўная публічная бібліятэка;
в) Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтва;
г) БДТ–1, БДТ–2;
д) Акадэмія навук Беларусі.



*3. Хто з аспірантаў БДУ заваяваў першы медаль на Алімпійскіх гульнях?*
а) Уладзімір Гараеў;
б) Сяргей Ліштван;
в) Аляксандр Мядзведзь;
г) Марыя Іткіна;
д) Камандор Маджыдаў.

*4. Які факультэт закончыў першы прызёр Алімпійскіх гульняў?*
а) хімічны;
б) фізічны;
в) філалагічны;
г) механіка-матэматычны.

*5. Хто са студэнтаў БДУ стаў прызёрам летніх Алімпійскіх гульняў 2008 г. у Пекіне?*
а) Міхась Сямёнаў;
б) Надзея Астапчук;
в) Сяргей Ліштван;
г) Уладзімір Гараеў;
д) Камандор Маджыдаў.

*6. На якіх факультэтах вучацца прызёры летніх Алімпійскіх гульняў 2008 г. у Пекіне?*
а) фізічны;
б) хімічны;
в) гістарычны;
г) юрыдычны;
д) факультэт міжнародных адносін.



*7. Хто са студэнтаў БДУ стаў фіналістам песеннага конкурсу "Еўрабачанне"?*
а) Дзмітрый Калдун;
б) Георгій Калдун;
в) Паліна Смолава;
г) Руслан Аляхно;
д) Анжэліка Агурбаш.

*8. Фёдар Дастаеўскі, радавое гняздо якога знаходзілася тут, у Беларусі, вызначаючы асноўную мэту і змест мастацтва слова, гаварыў: "Калі б закончылася зямля, і спыталіся там, дзе-небудзь,*



*у людзей: «Што вы, ці зразумелі ваша жыццё на зямлі і што вы аб ім заключылі?», дык чалавек мог бы моўчкі падаць кнігу __________: «Вось маё заключэнне аб жыцці, ці можаце вы за яго судзіць мяне?»"*
(Адказ уключае 9 літар, запішыце назву кнігі без пропускаў.)

*9. Якія тры дары маладосці адзначаў народны пісьменнік Беларусі Якуб Колас на сустрэчы са студэнтамі ў пасланні "Сябрам-студэнтам", надрукаваным у газеце "Беларускі універсітэт" 15 лістапада 1952 г.:*
а) "Ваша маладосць";
б) "Прасторныя, шырокія дарогі ў жыццё";
в) "Ваш уклад у навуку, у паэзію, у мастацтва, у справу будаўніцтва...";
г) "Залаты дар мірнага пасляваеннага жыцця";
д) "Зорны час выбару самастойнага шляху";
е) "Каханне, вучоба, грамадская дзейнасць".

*Пытанні "Віктарыны" падрыхтаваў дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры філалагічнага факультэта БДУ Уладзімір Навумовіч.*

**Умовы віктарыны**

У віктарыне могуць браць удзел студэнты і аспіранты БДУ.
Адказы неабходна прыносіць да 21 кастрычніка ў каб. 205 галоўнага корпуса БДУ (аддзел маладзевых праграм і праектаў УВРМ).
Падвядзенне вынікаў адбудзецца да Дня заснавання БДУ.
Грашовыя прэміі:
I месца – 350 тыс. руб.;
II месца – 250 тыс. руб.;
III месца – 150 тыс. руб.
Заахвочвальныя прэміі – 100 тыс. руб.
Кантактны тэлефон: 209-52-61

*Аргкамітэт*

ДАСЯГНЕННІ

# CHINA НА КІРЫЛІЦЫ



***Пасля Пекінскай алімпіяды нашы спартоўцы вярнуліся дадому з 19-цю ўзнагародамі. Акрамя непасрэднага ўдзелу ў медальных "разборках" (аб чым мы ўжо пісалі), наш універсітэт забяспечыў так бы мовіць культурна-лінгвістычны аспект выступлення нашых атлетаў.***

"Кітайска-руска-беларускі размоўнік", выдадзены Рэспубліканскім інстытутам кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ, дапамагаў нашым суайчыннікам пераадольваць моўныя бар'еры пры стасунках з арганізатарамі і жыхарамі гарадоў, дзе праводзіліся Гульні.

Непасрэдны распрацоўшчык канцэпцыі гэтага унікальнага выдання намеснік дырэктара РІК прафесар Ігар Малевіч адзначыў: "Гэта сапраўдны культуралагічны прарыў. Упершыню ў свеце створаны кітайскі размоўнік на славянскай кірыліцы. Гэта значнае нацыянальнае дасягненне".

Размоўнік рыхтаваўся спецыяльна да Алімпіяды–2008. Усе беларускія спартоўцы мелі яго пры сабе. Дзеля зручнасці ён нават быў зроблены памерам у кішэню. Падчас свайго афіцыйнага візіту ў КНР прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка таксама ім карыстаўся.

Айчынныя навукоўцы вырашалі асноўную праблему – правільнасць вымаўлення кітайскіх слоў. Напрыклад, імя сусветнавядомага філосафа Канфуцыя ў беларускай транскрыпцыі павінна гучаць зусім па-іншаму...

Расійскія спецыялісты таксама змагаюцца за чысціню вымаўлення кітайскай мовы. Сярод іх – галоўны рэдактар часопіса "Расія–Кітай" Людміла Ісаева. Аднак у аснове падрыхтаваных імі выданняў – ізноў жа лацінская транскрыпцыя. Што цікава, над гэтым працавалі 40 чалавек супраць 3-х нашых. Пакуль наклад нашага выдання абмежаваны – 1 тыс. асобнікаў. Але трэба мінімум 30 тыс. для таго, каб ім маглі карыстацца беларускія дыпламаты, бізнэсмэны, школьнікі.

"Безумоўна, гэта знакавая падзея не толькі для беларускай, але і для расійскай кітаістыкі, – працягвае Ігар Малевіч. – Гэта цудоўны дапаможнік не толькі для спартоўцаў, але і для айчынных дыпламатаў і прадпрымальнікаў, якія ўмацоўваюць эканамічныя сувязі паміж нашымі краінамі. Важна і тое, што зараз большая колькасць кітайскіх студэнтаў зможа знайсці сябе ў нашай краіне, зразумець мясцовую культуру. Беларускім школьнікам і студэнтам, якія вывучаюць кітайскую мову, ужо не прыйдзецца карыстацца лацінкай. Зараз у нас ёсць кірыліца!"

Працягам гэтай працы стане складанне "Беларуска-кітайскага размоўніка" і "Слоўніка найбольш ужывальных кітайскіх слоў і выразаў".

**Сяргей КУРЫЛА**

*Малевіч Ігар Аляксандравіч, былы амбасадар Беларусі ў КНР, аўтар кніг "Увага, Кітай!" і "Азіяцкі трохкутнік Малевіча", у мінулым журналіст газеты "Boston Globe".*

ДА ЎВАГІ

*Сустрэча прадстаўнікоў МУС РБ са студэнцкім актывам з БРСМ, Студсаюза і старастата адбылася 4 верасня на фізічным факультэце БДУ. На ёй гаворка ішла аб стане правапарадку ў нашай краіне за 7 месяцаў 2008 года.*

# УВАГА, КРЫМІНАЛ!

Паводле інфармацыі Міністэрства ўнутраных спраў у Беларусі на 100 тыс. насельніцтва прыходзіцца 957 крымінальных спраў. З амаль 93-х тыс. зарэгістраваных злачынстваў крадзяжы маёмасці складаюць 54 %.

У апошнія гады стала больш сур'ёзнай праблема наркаманіі. На 1 студзеня 2008 г. у наркалагічных дыспансерах на ўліку стаіць 11 тыс. наркаманаў і 2 тыс. таксікаманаў. Гэта афіцыйная лічба, аднак, на думку экспертаў, яе трэба павялічыць у некалькі разоў для ацэнкі сапраўдных маштабаў наркаманіі.

Распаўсюджанасць наркаманіі шчыльна звязана з праблемай СНІДу. На 1 ліпеня 2008 г. у Беларусі зарэгістравана больш за 9 тыс. ВІЧ-інфіцыраваных, з іх 5,3 тыс. чалавек заразіліся праз унутрывенныя ін'екцыі наркатычных рэчываў.

Каля траціны наркаманаў, якія знаходзяцца у той ці іншай стадыі захворвання, дабраахвотна развітваюцца з жыццём, а гэта ў асноўным маладыя людзі ад 15 да 29 гадоў. Па статыстыцы рызыка самагубства пры наркаманіі ўзрастае ў 3350 разоў!

На падставе ўжывання наркотыкаў у бягучым годзе ў рэспубліцы зарэгістравана 612 злачынстваў, у тым ліку 1 забойства, 12 рабункаў, 33 крадзяжы маёмасці.

Органамі ўнутраных спраў выяўлена больш за 2,6 тыс. злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркотыкаў і гандлем людзьмі, з іх амаль 42 % – звязаныя са збытам наркотыкаў.

У студзені–ліпені бягучага года зарэгістравана больш за 3,7 тыс. дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх загінуў 761 чалавек і амаль 4 тыс. паранена (451 ДТЗ здзейснена ў нецвярозым стане, нягледзячы на тое, што органамі унутраных спраў за кіраванне аўтатранспартам ў нецвярозым стане затрымана больш за 23,5 тыс. кіроўцаў). За перавышэнне хуткасці руху пакарана больш за 207 тыс. чалавек.

І яшчэ адна праблема – ілжывыя званкі аб мініраванні. Так, за 7 месяцаў 2008 г. у органы ўнутраных спраў рэспублікі паступіла 2 ананімныя паведамленні аб мініраванні аб'ектаў, з іх школ – 4, устаноў – 12, іншых аб'ектаў – 6. У выніку зробленых МУС захадаў, былі выяўлены 13 асоб з тых, хто тэлефанаваў (60 %), сярод іх – тры школьнікі.

### Пра выбух 4 ліпеня 2008 г. у г. Мінску

Падчас святочных мерапрыемстваў з нагоды Дня Незалежнасці Беларусі 4 ліпеня бягучага года, як вядома, спрацавала самаробнае выбуховае ўстройства. Цялесныя пашкоджанні рознай ступені цяжкасці атрымалі больш за 50 чалавек. У асноўным гэта маладыя людзі: студэнты сталічных ВНУ, Акадэміі МУС, навучэнцы профільных ліцэяў, тэхналагічных каледжаў, сярод якіх, магчыма, ёсць і вашыя таварышы ці знаёмыя.

Выбуховае ўстройства было размешчана ў двухлітровым пакунку апельсінавага нектару "Садочок". На ім ад рукі напісана "5700". Мяркуецца, што гэта кошт прадукту. Таму калі хто-небудзь калі-небудзь купляў ці бачыў падобныя пакункі з аналагічным надпісам, вялікая просьба – расказаць супрацоўнікам міліцыі. Для нас гэта вельмі важна!

Вынікі экспертызы паказалі, што выбуховае ўстройства выраблена дастаткова прафесійна з выкарыстаннем спецыяльных ведаў ў хіміі, фізіцы, выбуховай справе. Таксама дакладна ўстаноўлена, што для вырабу выкарыстоўвалася чарцёжная папера стандарту БССР 765-80 "Фарматка чарцёжная", артыкул 1С 036 5320 вытворчасці ААТ "Добрушская папяровая фабрыка «Герой працы»".

Калі вы палічыце патрэбным што-небудзь паведаміць праваахоўным органам, мы гарантуем канфедэнцыйнасць вашага звароту.

Тэлефоны: (8029)666-12-13 (Андрэй Яўгенавіч Паршын) і (8029)635-46-29 (Андрэй Валер'евіч Ананенка), а таксама 222-85-63, 227-21-24 (гарадская АТС); (8029)851-67-50 і (8029)851-67-60.

Мы гатовы сустрэцца з кожным!

**Паводле інфармацыі Міністэрства ўнутраных спраў**

АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў, гісторыі беларускай літаратуры, дыпламатычнай і консульскай службы;

ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ тэарэтычнай і прыкладной механікі;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай алгебры, функцыянальнага аналізу, інтэлектуальных сістэм, канстытуцыйнага права, крымінальнага права, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, грамадзянскага права, экалагічнага і аграрнага права, нямецкай мовы, фізічнага выхавання і спорту, міжнародных эканамічных адносін, міжнароднага права;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: рускай літаратуры, паліталогіі, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, грамадзянскага права, фізічнага выхавання і спорту;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: раманскага мовазнаўства, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, крымінальнага працэсу, крыміналістыкі, паліталогіі, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў; тэл. 209-54-36.

**НАЦЫЯНАЛЬНЫ НАВУКОВА-ВУЧЭБНЫ ЦЭНТР ФІЗІКІ ЧАСЦІЦ І ВЫСОКІХ ЭНЕРГІЙ БДУ (НЦ ФЧВЭ БДУ)**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады**

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА ў лабараторыю фізікі часціц – 1 чалавек.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: г. Мінск, вул. М. Багдановіча, 153, каб. 206; тэл. 292-60-34.

**ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады**

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА кафедры эканомікі і кіравання бізнесам

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, аддзел кадраў; тэл. 306-00-27.

ПРАЕКТЫ

# УСВЯДОМЛЕНАЕ БАЦЬКОЎСТВА

***Нядаўна быў зацверджаны план БДУ па рэалізацыі Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь на 2007–2010 гг. У яго выкананні будзе актыўна ўдзельнічаць створаны пры нашым універсітэце Цэнтр перспектыўнага дзяцінства. Ён бярэцца наладзіць работу "Школы ўсвядомленага бацькоўства", а таксама правесці цэлы шэраг семінараў-трэнінгаў.***



На думку дырэктара Цэнтра Алены Усціненка, у панятак "усвядомленае бацькоўства" уваходзяць духоўныя і маральныя каштоўнасці, нормы, правілы, якія спрыяюць большай адказнасці ў выкананні бацькоўскіх функцый, што з'яўляецца адной з перадумоў перспектыўнага дзяцінства.

На пачатку сваёй дзейнасці Цэнтр правёў міжнародны круглы стол пад сімвалічнай назвай "Навуковыя і практыка-арыентаваныя падыходы забеспячэння перспектыўнага дзяцінства", падчас работы якога свае погляды на праблему змаглі выказаць супрацоўнікі навуковых і адукацыйных устаноў Беларусі, Расіі, Вялікабрытаніі і Іспаніі, а таксама прадстаўнікі Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЭФ), грамадскіх арганізацый "Бацькоўскі дом" і "Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў". У ходзе дыскусіі было падкрэслена, што вырашэнне пытанняў дзяцінства нельга ўскладаць толькі на адну арганізацыю або спецыяльнае "дзіцячае" ведамства. Патрэбны партнёрскія адносіны, каардынацыя і ўзаемадзеянне паміж рознымі ведамствамі і грамадскімі арганізацыямі. Дарэчы, на круглым стале якраз і прысутнічалі прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі, унутраных спраў, аховы здароўя, працы і сацыяльнай абароны нашай краіны. Цэнтр надалей збіраецца дапамагаць гэтым установам засяродзіцца на вырашэнні праблем менавіта ранняга дзяцінства хлопчыкаў і дзяўчынак узростам да 7-мі гадоў.

Для апрабацыі і прапаганды новых метадаў работы Цэнтр актыўна займаецца рэалізацыяй праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЭФ), а менавіта – спрабуе стварыць мадэль фарміравання ўсвядомленага бацькоўства. Першае, што зроблена для ажыццяўлення ідэі, – сумесна з Цэнтрам палітычных і сацыялагічных даследаванняў БДУ праведзена апытанне сярод студэнтаў II і IV курсаў нашага універсітэта. Высветлілася, што яны маюць патрэбу ў ведах аб доглядзе і развіцці сваіх будучых дзяцей. І ўжо адбыліся семінары, прысвечаныя гэтай тэме і культуры сямейна-шлюбных адносін.

У межах "Школы ўсвядомленага бацькоўства" студэнты змогуць паўдзельнічаць у творчых майстэрнях, клубах па інтарэсах, фокус-групах, гульнях, трэнінгах, канферэнцыях, факультатывах і спецкурсах. Акрамя таго, створаны калектыў аўтараў, які падрыхтуе метадычныя рэкамендацыі для будучых і цяперашніх бацькоў.

**Ганна ЛАГУН**

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Гутарка з рэктарам БДУ прафесарам Васілём Стражавым пра новыя тэндэнцыі ў вышэйшай школе рэспублікі і ў навучальным працэсе ў Белдзяржуніверсітэце** – "Беларуская думка", № 8.

**Стварэнне Інстытута журналістыкі БДУ на базе факультэта журналістыкі** – БелТА (15.09); "Звязда" (16.09).

**Адкрыццё мультымедыйнай бібліятэкі ў вучэбным корпусе БДУ па вул. Кальварыйскай, 9** – "Звязда" (12.09, 16.09); БелТА (16.09); БелаПАН (16.09); "Советская Белоруссия" (16.09, 17.09).

**Адкрыццё новага корпуса Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ** – БелТА (11.09; 12.09); БелаПАН (12.09); tut.by (11.09); "Советская Белоруссия" (11.09, 15.09); "Народная газета" (13.09); "Звязда" (16.09).

**Лекцыя міністра замежных спраў ПАР ганаровага прафесара БДУ Нкасазаны Дламіні-Зума ў Белдзяржуніверсітэце** – БелТА (11.09); БелаПАН (09.09).

**Удзел вучоных БДУ ў рабоце Еўрапейскага цэнтра ядзерных даследаванняў (CERN) і ў запуску Вялікага адроннага калайдэра** – "Народная газета" (09.09, 11.09; 16.09); "Советская Белоруссия" (11.09); БелаПАН (10.09); naviny.by (11.09); БелТА (15.09); telegraf.by (16.09).

**Вынікі алімпіяды па web-праграмаванні, арганізаванай механіка-матэматычным факультэтам БДУ** – "Репетитор", № 8.

**Засяленне ў інтэрнаты** – "Знамя юности" (05.09).

**Падрыхтоўка спецыялістаў для работы на АЭС** – "АиФ" (03.09); БелТА (16.09).

**Святкаванне Дня ведаў у БДУ** – БелаПАН (01.09); naviny.by (01.09); "Звязда" (29.08); "Вечерний Минск" (03.09).

*Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## ВІНШУЕМ!

# ЗНАЁМСТВА Ў РЫТМЕ "NON STOP"

***18 верасня ў актавай зале Ліцэя БДУ Студэнцкім гарадком была арганізавана святочная праграма, прымеркаваная да Дня першакурсніка.***

Мерапрыемства складалася з некалькіх частак. У першай адбыліся вандроўкі па інтэрнатах БДУ і пазнавальная экскурсія для першакурснікаў. Не сакрэт, што ў кожнага інтэрната ёсць свая разыначка, якую ў іскрыстых творчых вобразах раскрылі новаспечаным студэнтам старэйшыя таварышы. Так, жыхары "шасцёркі" сустрэлі вядучага з кубачкам кавы, паказаўшы сваю гасціннасць і шчырасць. Курсанты ваеннага факультэта з інтэрната № 5 здзівілі афіцэрскай галантнасцю і ваеннай выпраўкай падчас венскага вальса. Прадстаўнікі інтэрнатаў № 3 і 10 распавялі пра тое, як яны любяць бавіць час у кампаніі сяброў з песнямі пад гітару. У другой частцы святочнай праграмы падвялі вынікі штогадовай спартакіяды Студгарадка. І нарэшце, пераходны кубак на цэлы год пасяліўся ў інтэрнаце № 6.

"Дысертам" святочнай праграмы стала выступленне танцавальнага калектыву "Non Stop", які сёлета святкуе 10-годдзе. Выступоўцы паказалі гледачам свае найлепшыя нумары і новыя танцавальныя кампазіцыі.

За плячыма гурта, створанага па студэнцкай ініцыятыве, багатая творчая біяграфія: 3 сольныя канцэрты, выступленні на многіх фестывалях, мерапрыемствах Студгарадка, канцэртных пляцоўках Белдзяржуніверсітэта і іншых ВНУ, прадпрыемстваў і арганізацый сталіцы. На гарадскіх і раённых фестывалях "Non Stop" неаднаразова заваёўваў прызавыя месцы. Нязменным кіраўніком калектыву з'яўляецца Ірына Чахоўская. Студэнцкі гарадок віншуе танцораў з юбілеем і зычыць натхнення і творчых поспехаў!

**Анастасія КРЫВЯНОК**



*Танцавальны калектыў "Non Stop"*

## НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

З 27 па 31 жніўня ў Карлавых Варах (Чэхія) праходзіў V Міжнародны студэнцкі кінафестываль "Fresh Film Fest". Упершыню ў асноўны конкурс у ліку 16-ці фільмаў была адабрана праца з Беларусі – фільм "Фокусная адлегласць" (рэжысёр – Андрэй Куціла, відэастудыя SVS Студэнцкага гарадка БДУ). Усяго на фестываль былі заяўлены 931 фільм з 48-мі краін.

***

З 8 па 11 верасня ў інтэрнатах адбыліся сустрэчы адміністрацыі Студгарадка з першакурснікамі. Мэтай было знаёмства новых жыхароў інтэрнатаў з кіраўніцтвам і распавед пра шматлікія мерапрыемствы, а таксама магчымасці для студэнтаў праявіць сябе. Напрыканцы сустрэчы дырэктар Студгарадка Міхаіл Чарапеннікаў здзейсніў (у форме раздачы сімвалічных прызоў) па адным запаветным жаданні студэнцкіх выпускнікоў, пасля чаго першакурснікі традыцыйна паздымаліся для летапісу інтэрната.

9 верасня ў канферэнц-зале інтэрната № 2 адбыліся метадычныя заняткі для супрацоўнікаў Цэнтра педагагічных тэхналогій Студэнцкага гарадка "Методыка арганізацыі выхаваўчых і сацыякультурных мерапрыемстваў з навучэнцамі і студэнтамі", якія правёў дацэнт кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі БДУ кандыдат педагагічных навук Віктар Чэчат.

***

Нягледзячы на тое, што да пачатку адборачнага этапу III Студэнцкага фестывалю кіно і відэа "Кінагрань" яшчэ далёка, у адрас аргкамітэта ўжо паступаюць работы з Вялікабрытаніі, Германіі, Нідэрландаў, Польшчы, Румыніі, Турцыі, Чэхіі. Гэта надае конкурсу міжнародны характар. Арганізатарамі фестывалю з'яўляюцца Беларускі дзяржаўны універсітэт і аддзел па справах моладзі Мінгарвыканкама. Пройдзе "Кінагрань" у сакавіку 2009 года.

## СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

# НОВЫ МАРШРУТ АТРЫМАЎ ЖЫЦЦЁ

***Дабрацца да месца правядзення заняткаў многім студэнтам з філіяла БДУ, што знаходзіцца ў Гаі (п. Шчомысліца), стала лягчэй дзякуючы новаму аўтобуснаму маршруту № 132.***

Дагэтуль жыхароў з інтэрнатаў № 3 і 10 (а гэта студэнты ФФСН, Інстытута журналістыкі, ДзІКСТа, замежнікі з ФДА) падвозіў да месца вучобы аўтобус № 47, які ідзе па маршруце "Філіял БДУ–Вакзал". Курсіруюць гэтыя аўтобусы досыць часта (з прамежкам каля 20–25 хвілін), але раніцой і ўвечары іх салоны набіты студэнтамі і жыхарамі раёна. Асабліва цяжка даводзілася іншагароднім студэнтам факультэта журналістыкі, а таксама філасофіі і сацыяльных навук, дарога на вучобу якіх нагадвала раней марафон з перапонамі ў выглядзе 1–3 перасадак грамадскага транспарту. Ведаючы пра гэту праблему, дэканы згаданых факультэтаў Сяргей Дубовік і Анатоль Рубанаў звярнуліся да сталічнага мэра Міхаіла Паўлава з просьбай арганізаваць падвоз студэнтаў з філіяла БДУ да вучэбнага корпуса па вул. Кальварыйскай. І гэты зварот не застаўся без увагі.

Маршрут № 132 "ДС «Дружная»–Філіял БДУ" ходзіць штодня, акрамя нядзелі, са следаваннем па вул. Вакзальнай, Суражскай, Маскоўскай, пр. Незалежнасці, вул. Гарадскі Вал, Раманаўская Слабада, Кальварыйская, К. Цэткін, пр. Дзяржынскага, МКАД, вул. Курчатава і назад. Усё падарожжа гэтым аўтобусным напрамкам зойме ў вас 50 хвілін.

Шлях жа ад інтэрната да месца вучобы цяпер зойме ў студэнтаў каля 25 хвілін.



Паводле слоў Сяргея Дубовіка, які якраз з'яўляецца дэпутатам Мінскага гарадскога савета дэпутатаў, гэты маршрут паспрыяў студэнтам, якія пражываюць у інтэрнатах № 3 і 10. Як будзе далей – паглядзім, рэйс уведзены нядаўна і пакуль прамежкі часу паміж курсуючымі аўтобусамі даволі істотныя. Але калі студэнты вывучаць расклад – будуць паспяваць на заняткі. Калі ж "нестыкоўкі" застануцца, то давядзецца хадайнічаць накont дадатковых аўтобусаў.

Спадзяёмся, што неўзабаве так і будзе. Бо пакуль у ранішнюю студэнцкую гадзіну-пік даецца аўтобус у 7.35 (прычым заняткі на журфаку пачынаюцца толькі ў 8.30 і недзе з паўгадзіны студэнты тулююцца без справы), а другі толькі праз болей чым паўтары гадзіны – на 9.12. Гэта значыць, што тыя, хто не паспеў сесці на 7.35, ізноў павінны дабірацца па-старому, з перасадкамі, ці дачакацца наступнага аўтобуса і прапусціць першую пару. Акрамя таго, значная колькасць студэнтаў мусіць вучыцца ў другую змену, а апошні рэйс ад факультэтаў да Шчомысліцы адпраўляецца ў 18.00, і гэта стварае праблему даехаць дадому пасля заняткаў.

Хочацца верыць, што добры намер дэканаў і пачын гарадскіх улад займее працяг і ніякай лыжкі дзёгцю ў бочцы мёда не застанецца.

**Кацярына РАМАНАВА**

**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

## АКТУАЛЬНА

# СТУДБІЛЕТ: НАРЭШЦЕ НА 5 ГАДОЎ

**Студэнтам БДУ больш не прыйдзецца пачынаць навучальны год з бясконцай чаргі ў банк: цяпер студэнцкія білеты будуць выдавацца адзін раз тэрмінам на пяць гадоў для студэнтаў дзённага аддзялення і на шэсць гадоў для студэнтаў завочнага аддзялення.**

Разам з тым гэты дакумент па-ранейшаму абавязковы для жадаючых трапіць у некаторыя інтэрнаты, карпусы з каштоўным абсталяваннем, а таксама дае магчымасць атрымаць бясплатны выхад у інтэрнэт і карыстацца медыятэкамі.

Падрабязнасці новаўвядзення ў патлумачыў Юрый Варатніцкі, дырэктар Цэнтра інфармацыйных тэхналогій БДУ:

– Неабходнасць штогадовай замены студэнцкіх білетаў была абумоўлена наяўнасцю некаторых ільгот для навучэнцаў, напрыклад, пры праездзе на гарадскім транспарце ці чыгунцы. Паколькі зараз яны адменены і студэнцкі білет служыць цяпер толькі для ідэнтыфікацыі асобы, мы са згоды Міністэрства адукацыі падоўжылі яго сапраўднасць да канца вучобы. У адзінкавых студэнтаў, зразумела, білеты абавязкова будуць забірацца.

У сваю чаргу дэпартамент Міністэрства фінансаў па дзяржзнаках распрацаваў новы бланк студэнцкага білета, які вырабляецца на прадпрыемстве "Крыптатэх" і абаронены дадатковымі сродкамі ад падробкі. Болей таго, зараз ён зарэгістраваны як бланк студэнцкага білета Міністэрства адукацыі – гэта значыць, у прынцыпе, можа выкарыстоўвацца і ў іншых навучальных установах.

З 1 верасня гэтага года стала дзейнічаць новая прапускная сістэма ў інтэрнатах № 2 і 6, куды зараз можна ўвайсці толькі па студэнцкім білеце. Аналагічная сітуацыя будзе распаўсюджана і на іншыя інтэрнаты. Акрамя гэтага, пачынаецца эксплуатацыя прапускных сістэм у двух карпусах універсітэта, дзе знаходзіцца каштоўнае абсталяванне, – гэта будынкі хімічнага факультэта і факультэта радыёфізікі і электронікі. Каб трапіць у згаданыя памяшканні, студэнт абавязкова павінен мець студэнцкі білет, а выкладчык – пасведчанне, якое робіцца па тых жа тэхналогіях.

Студэнцкія білеты навучэнцы набываюць за ўласныя сродкі. Іх кошт вызначаецца толькі фактычнымі выдаткамі на іх выраб. Зараз білет каштуе каля 14 тыс. руб. – крыху менш, чым у мінулым годзе, і заплаціць гэтую суму студэнт мусіць толькі адзін раз.

**Анастасія ШМІГЕЛЬСКАЯ**

## СВЯТКАВАННІ

# СЛОВЫ АДЛЯТАЮЦЬ, НАПІСАНАЕ ЗАСТАЕЦЦА...

7 верасня ў Барысаве адбылося традыцыйнае свята Ye Вялікасці Кнігі – Дзень беларускага пісьменства. У горад на Бярэзіне прыбыло мноства ўдзельнікаў і гасцей з розных краін. Асабліва прадстаўнічай была дэлегацыя з суседняй Расіі.

Сюды з'ехаліся прадстаўнікі ўлады, духавенства, выдаўцы, навукоўцы, пісьменнікі, журналісты, студэнты і школьнікі, артысты...

У ліку ганаровых гасцей на ўрачыстасцях быў рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў.

Свята атрымалася вельмі маштабным. Цэнтр горада – вуліцы, плошчы, старадаўні парк – былі запоўнены кніжнымі экспазіцыямі, імправізаванымі сцэнічнымі пляцоўкамі. Па-сапраўднаму працаваў "Горад майстроў", гучалі вершы, песні, музыка...

Нашу універсітэцкую кнігу тут прадставілі ўпраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы і РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ".

Кнігі выдавецтва БДУ, а гэта курсы лекцый, вучэбныя дапаможнікі, падручнікі, вучэбна-метадычныя комплексы, даведнікі і манаграфіі, былі размешчаны ў экспазіцыі тэматычных кніжных пляцовак "Шлях да ведаў", "Здароўе, спорт, турызм. Году Здароўя прысвячаецца", а таксама ў павільёне "Сучасная беларуская кніга" і мелі вялікі попыт у наведвальнікаў.

З вялікім уздымам прайшлі прэзентацыі кніг "Структура знания о языке в Кирилло-Мефодиевской филологической школе IX–X веков"; "История западных славян (с древнейших времен до 1914 г.); "История культуры южных и западных славян (IX–XVII в.)"; "Грамматическая терминология русского и белорусских языков: истоки, структура, функционирование"; "Гісторыя беларускага мовазнаўства (1918–1941)": у 2-х частках, частка 2; "Беларускія мовазнаўцы" у 2-х тамах, том 2; "Лекции по истории литературы Древней Руси", "Стратегия устойчивого развития экологического туризма в Беларуси", "Экологические проблемы Беларуси", "Приемы нападения и защиты в современном волейболе", "Практикум по физической культуре студентов" з удзелам аўтараў БДУ А. Сурковай, А. Салькова, Г. Гваздовіч, М. Прыгодзіча, В. Каляды, І. Чароты і гасцей з Сербіі і Расіі.

Да стэнда з кнігамі БДУ таксама завітаў наш паважаны аўтар Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Балгарыі ў Беларусі – Петка Ганчаў.

Віктарына "Мой універсітэт" і беспройгрышная латарэя зацікавілі і дзяцей і дарослых. Дапамаглі правесці гэтую акцыю супрацоўнікі Фундаментальнай бібліятэкі БДУ Ала Буціна і Наталля Карбановіч.

Наступным разам Дзень беларускага пісьменства будзе арганізаваны ў горадзе Смаргонь Гродзенскай вобласці.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы**



*Правядзенне віктарыны "Мой універсітэт" і бяспройгрышнай латарэі. Фота Н. Герасімовіч*

## УСМІХНЕМСЯ

Запыталіся аднойчы ў *Альберта Эйнштэйна*, як адбываюцца геніяльныя адкрыцці.

– Даволі проста, – адказаў Эйнштэйн. – Усе навукоўцы лічаць, што гэтага не можа быць. Але знаходзіцца адзін дурань, які з гэтым не пагаджаецца, і даказвае чаму.

***

*Ісак Ньютан* ніколі не спяшаўся друкаваць свае працы. Калі яго неяк папрасілі апублікаваць у "Працах Каралеўскага таварыства" некаторыя матэматычныя пошукі, ён пагадзіўся пры ўмове, што ў друку не будзе ўзгадвацца імя аўтара.

– Далібог не ведаю, навошта мне вядомасць? – абвясціў ён сваё рашэнне. Гэта можа толькі павялічыць кола маіх знаёмых, а я, наадварот, імкнуся пазбягаць іх.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

19 верасня 2008 года
Падпісана да друку 28.08.2008 г.
Зак. 959. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by